# ДРАМАТУРГІЯ ФРАНЦІШКА АЛЯХНОВІЧА Ў АЦЭНЦЫ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

*Anna KASPEREK*
UMCS, Lublin

**Streszczenie**

DRAMATURGIA FRANCISZKA ALACHNOWICZA
W OCENIE MAKSYMA HARECKIEGO

Tematem rozważań jest dramaturgia Franciszka Alachnowicza w ocenie Maksyma Hareckiego. Wart uwagi jest fakt, iż Maksym Harecki był również dramaturgiem, ale w historii literatury białoruskiej zapisał się szczególnie jako autor pierwszej *Historii literatury białoruskiej.* Powyżej prześledzona dramaturgiczna twórczość Franciszka Alachnowicza, została wysoko oceniona z punktu widzenia innego dramaturga, którym był Maksym Harecki.

Разгляд тэмы традыцыйна пачнем са звароту да кароткіх біяграфій абодвух пісьменнікаў.

Максім Гарэцкі нарадзіўся ў 1893 годзе на Магілёўшчыне. У 1914 годзе пайшоў вольназапісным у армію і з пачаткам Першай сусветнай вайны ўдзельнічаў у баях. У 1916 годзе вучыўся ў Паўлаўскім ваенным вучылішчы ў Петраградзе. Камісаваны з арміі ў сувязі з хваробай у 1918 годзе ў Смаленску. У 1919 годзе пераехаў спачатку ў Мінск, а потым у Вільню. За сувязь з камуністамі трапіў у Лукішскую турму ў 1922 годзе. Ад 1923 года жыў у БССР. Працаваў выкладчыкам роднай мовы і літаратуры ў розных навучальных установах. З 1928 года займаўся навуковай працай у Інбелкульце і БАН (Беларускай Акадэміі Навук). У 1930 годзе Гарэцкі быў арыштаваны і высланы на 5 гадоў у Вятку. Другі раз быў арыштаваны ў 1937 годзе, а ў 1938 расстраляны ў Вільні. У 1959 годзе Максім Гарэцкі быў поўнасцю рэабілітаваны.

Першае апавяданне Максіма Гарэцкага было надрукаванае ў 1913 годзе ў газеце “Наша Ніва” пад псеўданімам Максім Беларус. У 1914 годзе выйшоў зборнік “Рунь”, у 1919 драматызаваная аповесць “Антон”, аповесць “Дзве душы”, у 1926 годзе апублікаваны дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне”, аповесць “Ціхія песні” – другая назва – “ Ціхая Плынь”, зборнік апавяданняў “Досвіткі”. Напісаў раманы “Віленскія камунары”, “Камароўская хроніка”. Гэты апошні раман застаўся незакончаным.

Максім Гарэцкі – гэта аўтар першай “Гісторыі беларускай літаратуры”, выдадзенай у 1920 годзе. Ён як выкладчык беларускай літаратуры, пісь-

меннік з высокай нацыянальнай свядомасцю, адчуваў патрэбу ў такім падручніку. „Гарэцкі ўсведамляў неабходнасць навуковага асэнсавання шматвяковага развіцця беларускай літаратуры, мовы, наогул, культуры, разумеў ролю ‹‹Гісторыі...›› як фактару адраджэння беларускай нацыі”[1]. Заслуга Гарэцкага як даследчыка вялікая, таму што не стаў ён чакаць прысуду гісторыі, а сам зрабіў першую ацэнку радаводных шляхоў беларускай літаратуры. У сваім падручніку ён аддаў належную ўвагу фалкларыстам, філалогам і іншым беларусазнаўцам. Даследчык апісаў свой цэласны мастацкі погляд на пакутную і няроўную амплітуду адраджэння беларускага пісьменства XIX стагоддзя.

У *Гісторыі беларускае літаратуры* шырока прадстаўлены крытычны разгляд мастацкіх твораў, у тым ліку некаторых п’ес Францішка Аляхновіча.

Аляхновіч нарадзіўся 3 сакавіка 1883 года ў Вільні. Вучыўся ў гімназіі, а потым у драматычнай школе ў Кракаве. Закончыў, аднак, драматычную адукацыю ў Варшаве, у школе Музычнага Таварыства. У 1908 годзе, пераехаўшы ў Вільню, разам з артыстам-танцорам І. Буйніцкім, выдатным рэвалюцыянерам А. Бурбісам і іншымі пачаў ладзіць нацыянальны тэатр.

Выдаваў тыднёвік *Perkunas* на польскай мове, за артыкулы ў якім быў прыцягнуты да судовай адказнасці. Аляхновіч уцёк ў Польшчу, дзе пад псеўданімам Юрый Мондвід іграў у польскіх тэатрах. У 1919 годзе ён вярнуўся ў Вільню, дзе быў арыштаваны і кінуты ў турму.

„У астрозе пачалася яго літаратурная творчасць”[2]. Тут ён напісаў першую п’есу *На Антокалі*. Пасля турмы Аляхновіч, жывучы ў Вільні, настаўнічаў у школе, актыўна ладзіў беларускія спектаклі, у якіх сам удзельнічаў як акцёр. Шмат напісаў для беларускай сцэны: *На вёсцы, Бутрым Няміра, Манька, Калісь, Базылішак.*

У 1926 годзе Францішак Аляхновіч пераехаў з Вільні ў Менск. Тут напісаў яшчэ некалькі п’ес: *Чорт і Баба, Страхі жыцця, Дзядзка Якуб.* Працаваў рэдактарам *Беларускага жыцця* і *Беларускага звону*.

У 1927 годзе драматург быў арыштаваны і асуджаны на 5 гадоў лагерэй. Адбываў пакаранне на Салаўках. У 1933 годзе Савецкая ўлада абмяняла Аляхновіча на вязня польскай турмы Бараніслава Тарашкевіча. Выйшаўшы на волю, ён пачаў пісаць успаміны, якія склаліся ў дакументальную аповесць *У капцюрох ГПУ*, якая была надрукавана ў 1937 годзе. Вярнуўся да сваёй даўняй журналісцкай прафесіі – пачаў рэдагаваць тыднёвік *Беларускі голас,* жыў у Вільні.

За апошнія гады свайго жыцця Аляхновіч напісаў: *Цені, Птушка шчасця, Шчаслівы муж, Няскончаная драма, Пан міністар.* У 1943 годзе бела-

[1] М. Гарэцкі, *Гісторыя беларускае літаратуры*, Мінск 1992, с. 410.
[2] М. Гарэцкі, *Гісторыя беларускае літаратуры,* с. 359.

руская грамадскасць Вільні ўрачыста адзначыла 60-годдзе Францішка Аляхновіча, назваўшы яго „бацькам беларускага тэатра”. 3 сакавіка 1944 г. ён быў забіты вечарам у сваёй кватэры. Пахаваны ў Вільні.

Цяпер разгледзім, як ацэньваў драматургічную творчасць Ф. Аляхновіча Максім Гарэцкі. Трэба памятаць, што Гарэцкі таксама быў драматургам, аўтарам драматычных абразкоў *Антон, Ганен і Любачка і* іншых.

Паводле Максіма Гарэцкага, п’еса *На Антокалі* „гэта – надта добра зробленая, мастацкая фатаграфія жыцця віленскіх жыхароў прадмесця Антокаля”[3]. Разам з гэтаю п’есаю ў творчасць Аляхноьіча увайшла вялікая тэма – тэма мяшчанства. Гэта было не выпадкова, таму што пісьменнік добра ведаў віленскае грамадства. У гэтым творы аўтар адлюстраваў вобразы мяшчанскага асяродздзя (Вінцэнта і Міхаліну Сліжукоў, іх дачку Зоську, паштовага служачага Радзівіловіча і некаторых іншых). Аляхновіч „выкрывае тыя жыцёвыя фетышы, якім яны пакляняюцца, якія засланяюць і скажаюць іхнія ўяўленні аб сапраўдных чалавечых каштоўнасцях”[4]. Такім фэтышам, які кіруе іхнім жыцём сталі грошы. Дзеля грошай Зоська кідае свайго каханага Юзка і збіраецца выйсці за Радзівіловіча, які павінен атрымаць вялікую спадчыну. Як бачым, тут каханне арэчаўленае і прыземленае.

У гэтай п’есе Аляхновіч трапна паказаў новую для беларускай літаратуры сферу мяшчанскага жыцця. Аднак, на думку М. Гарэцкага *На Антокалі,* не ўзнімае яшчэ вострых сацыяльных праблем, хоць і ўтрымлівае дакладную скіраванасць стрэлаў у бок мяшчанства, чалавечых слабасцей і заган.

Дастаткова сказаць, што толькі 1916-1917 гадах з-пад пяра Аляхновіча выйшлі такія п’есы як: *На вёсцы, Бутрым Няміра, Манька, Базылішк, У лясным гушчары, Калісь.* П’есы былі розныя па памеры і па адрасу іх прызначэння. Былі п’есы для дарослых гледачоў і для дзяцей.

Твор *На вёсцы* – гэта сцэнічны абразок аб каханні хлопца да дзяўчыны, якая служачы ў паноў адракалася ад усяго мужыцкага. П’еса напісана вельмі жыва і цікава, лічыў Максім Гарэцкі, але адзначаў, што ў Аляхновіча, які не жыў на вёсцы і вёскі не ведаў, сяляне гаварылі такой жа самай моваю, як мяшчане і інтэлігэнцыя. У творы яўна адчувалася дакучлівае маралізаторства, ідэалізацыя вясковага жыцця, „асаблівасці і матывы, якія не атрымалі працягу і развіцця ў пазнейшай творчасці драматурга”[5].

Наступная п’еса Аляхновіча – *Бутрым Няміра* - напісана была паводле легенды Вацлава Ластоўскага *Каменная труна*. Гарэцкі сцвярджаў, што гэты твор мае высокія літаратурныя і сцэнічныя вартасці. „П’еса вылучаецца

[3] Тамсама, с. 359-360.

[4] *Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.*, пад рэд.І. Навуменкі, В. Каваленкі, у 4 т. Том I, Мінск 1999, с. 337.

[5] *Гісторыя беларускай літаратуаы XX ст.*, с. 339.

сваёй стылізаванасцю, прыгаством мовы (...), пэўнасцю псіхалагічных абрысовак, стыльнасцю і адзінствам у развіцці падзей. Як твор сцэнічны, яна азначаецца дасканаласцю тэхнікі і колкімі харошымі, з мастацкага боку эфэктамі”[6].

*Бутрым Няміра* польскаму чытачу, безумоўна, нагадвае твор Адама Міцкевіча *Дзяды*. Як у паеме Міцкевіча, так і ў п’есе Аляхновіча, сустракаем духаў, якія прыходзяць і апавядаюць аб прычыне іх смерці.

П’есу-казку Аляхновіча – *Базылішк* трэба разглядаць як другую пасля *Бутрыма Няміры* спробу драматурга паказаць далёкую мінуўшчыну Беларусі.

Наступным творам драматурга, які Гарэцкі лічыў вельмі добрай інсцэнізацыяй, была вядомая сатырычная казка *Чорт і Баба*.

У творчасці Аляхновіча мы бачым выразныя рэвалюцыйныя настроі. Як прыклад, можам назваць п’есу *Страхі жыцця*, дзе аўтар ніводным словам не згадаў, дзе і калі адбываецца дзеянне, але вельмі лёгка можна здагадацца, што гэта ўспаміны самога Аляхновіча з апошніх гадоў нямецкай акупацыі ў Вільні. „Прачытаўшы, ці паглядзеўшы на сцэне ўсе тры акты, мы так уражаны жахам гэтага зла, гэтых страхаў, што сэрца закіпае гняўлівым абурэннем і напаўняецца смагаю новай творчасці, жаданнем зніштожыць страхі строга свету і стварыць новае, яснеючае, не блізкае да ўсякіх страхаў жыццё”[7].

На думку Максіма Гарэцкага, самай лепшай часткай гэтай драмы з’яўляецца момант, калі дзяўчына першы раз прыходзіць з вуліцы і сустракае на парозе свайго каханага. Яе маналог вызначаецца вялікім мастацкімі вартасцямі. „А бясспрэчна найлепшыя часткі – маналогі цэнтральнай фігуры, здурнелага летучоніка і п’яніцы, знямоглага ад страху старога бацькі”[8].

Як бачым на прыкладзе прыведзеных тут п’ес, змест творчасці Францішка Аляхновіча вельмі разнастайны.

Існуе ўмоўны падзел твораў Аляхновіча на чатыры групы, якія выдзяліў вядомы літаратуразнаўца і грамадзкі дзеяч І. Дварчанін. Першая група, гэта творы побытавага плану. Сюды адносяцца п’есы: *На Антокалі, Манька, Калісь.* Другая група – гэта творы рэвалюцыйнага зместу. У гэтую групу ўваходзіць „невялікі па памеры абразок *Калісь* напісаны з абвостраным драматызмам, з дынамічным, імклівым разгортваннем дзеяння”[9]. Трэцюю і чацвёртую групу складаюць творы, заснаваныя на літаратурных і фальклорных

[6] М. Гарэцкі, *Гісторыя беларускае літаратуры,* с. 361.
[7] Тамсама, с. 362.
[8] Тамсама, с. 363.
[9] А. Сабалеўскі, *Драма жыцця*,[ў]: *У капцюрох ГПУ* Францішка Аляхновіча, Мінск 2005, с. 10.

крыніцах. Сюды уваходзяць п’есы: *Бутрым Няміра, Базылішк, Чорт і Баба, У лесным гушчары.*

У творах драматычнага гучання Аляхновіч выкарыстоўваў прыёмы і сродкі меладрамы, якія аказвалі на гледачоў асабліва моцнае эмацыянальнае ўздзеянне. Максім Гарэцкі падкрэсліваў, што ў Аляхновіча вельмі выразна паказаныя рэчы бытавыя, псіхалагічныя, і нават філасофскія. Як пісаў Гарэцкі: „Аднакова здольны ён (Аляхновіч) і ў драме, і ў лёгкай камедыі; умее перадаць тон нашых старых камедый (...)”[10].

Апошнія п’есы Аляхновіча: *Пан Міністр* і *Няскончаная драма* добра паказваюць беларускі рух, жыццё беларускіх працаўнікоў-адраджэнцаў. Як казаў Гарэцкі „Тут мы бачым асоб, якія лёгка нагадваюць нам шырока вядомых у гісторыі нашага руху людзей, часам бачым нават некаторую партрэтнасць. Гэта вельмі добра, бо мы глыбока задавальняемся, калі бачым праўдзівых герояў адраджэння ў тым асвятленні, якое жыве ў душы кожнага з нас, і калі бачым ‹‹паноў міністраў›› у становішчы, у якім яны апынуліся па сваіх ‹‹заслугах››”[11].

Драматургія Францішка Аляхновіча ў сваей аснове глыбока гуманная і адначасова поўная вялікіх дысанансаў, непрымірных ідэйна-філасофскіх супярэчнасцяў як мага лепш адлюстроўвае асобу самога аўтара і яго час”[12].

На думку М. Гарэцкага, Францішак Аляхновіч – гэта выдатны драматург, не здарма названы: бацьком беларускага тэатра.

ЛІТАРАТУРА:

1. Гарэцкі М., *Гісторыя беларускае літаратуры*, Мінск 1992, сс. 478.
2. *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя*, пад рэд. Навумінкі І., Каваленкі В., у 4 т., том I, Мінск 1999, с. 335-357.
3. Каспэрэк Анна., *Вобраз жыцця ў турме і лагерах, убачаны вачыма беларуса Францішка Аляхновіча і паляка Густава Геррлінг-Грудзінскага*, [у:] *Зборніку навуковых прац Міжнароднай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі,* пад. рэд. З. П. Мельнікавай, Брэст 2006, с. 9–15.
4. Сабалеўскі А., *Драма жыцця,* [у:] *У капцюрох ГПУ* Францішка Аляхновіча, Мінск 2005, с. 5-20.

[10] М. Гарэцкі, *Гісторыя беларускае літаратуры*, с. 363.
[11] Тамсама, с. 363-4.
[12] *Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.,* с. 335.